**Гуманітарныя навукі і дэмакратызацыя на постсавецкай прасторы:**
**што зроблена, што не зроблена і што рабіць далей?**
**А таксама: грамадская супольнасць у гуманітарнай суполцы**

Аб'ява пра міжнародны міждысцыплінарны семінар
Кіеў, Украіна, 4-6 красавіка 2014 г.

Пасля распаду Савецкага Саюза вышэйшая адукацыя і гуманітарныя даследваньні перажылі грандыёзныя змены, у тым ліку рост індывідуальных ініцыятыў. Новыя інстытуцыі і новыя медыі адчынілі новыя магчымасьці да самарэалізацыі, асабліва для маладых навукоўцаў. Плыня інавацыённых ідэй, аналітычных падыходаў і практык палілася з Захаду ў Беларусь, Расію і Ўкраіну.

Сёння мы можам падсумаваць кошт пераменаў, што пачаліся ў 1991 годзе. Якія новыя інстытуцыі, медыйныя і інтэлектуальныя тэндэнцыі найбольш паўплывалі на высшую асвету і гуманітарныя даследванні? Ці быў гэты ўплыў пазітыўным альбо негатыўным? Якія новыя часопісы, асацыяцыі, інфармацыйныя групоўкі і тэматычныя цэнтры зрабіліся уплывовымі?

Які статус міжнароднай камунікацыі сярод навуковых супольнасцей у Беларусі, Расеі і Украіне? Якім чынам стасуюцца грамадзянская супольнасць гуманітарыяў і публічная сфера, НДА і медыі? Якім чынам гэтыя грамадзянскія сферы павінны ўплываць адна на адну? Як ставяцца маладыя навукоўцы да сённяшніх магчымасцей стварэньня нефармальных асацыяцый? Ці робяцца яны сапраўды «новымі ініцыятарамі»?

Незалежныя ініцыятывы ў сферы гуманітарных даследванняў з’яўляюцца адным з асноўных напрамкаў дзейнасці Міжнароднай асацыяцыі гуманітарыяў (www.mag-iah.com) і электроннага часопіса *«The Bridge-МОСТ»* (www.thebridge-moct.org).

Міжнародная асацыя гуманітарыяў была створана экспертамі (peer reviewers) незалежнай праграмы даследчых грантаў (ACLS Humanities Program in Belarus, Russia, and Ukraine). Электронны часопіс *«The Bridge-МОСТ»* з’яўляецца інфармацыйным форумам, «пунктам сустрэчы» і мае намер забяспечваць камунікацыю навукоўцай праз геаграфічныя, дысцыплінарныя і пакаленчыцкія межы.

МАГ і часопіс «The Bridge-МОСТ» абвяшчаюць новы адкрыты, семінар, які адбудзецца ў Кіеве 4-6 красавіка 2014 г. і будзе прысвечаны «грамадзянскай супольнасці ў супольнасці гуманітарыяў». Тэзісы семінару мусяць быць апублікаваныя ў часопісе «The Bridge-МОСТ».

**Удзел ў семінары**

Да ўдзелу ў семінары запрашаюцца сябры МАГ, чытачы часопіса «The Bridge-МОСТ» і ўсе тыя, каму цікавая яго тэматыка. Заяўка на ўдзел складаецца з эсэ (пяць старонак), прысвечанага адной з тэмаў семінара, а таксама кароткой інфармацыі пра аўтара (імя, месца працы, навуковыя інтарэсы, асноўныя публікацыі) .

Заяўкі ў электронным фармаце трэба даслаць да 10 снежня 2013 г. на адрас: iahumanities@gmail.com, а таксама obukhina@acls.org

Адабраныя аргкамітэтам аўтары атрымаюць узнагароду $200, а таксама выплату транспартных коштаў у межах рэгіёна для ўдзелу ў семінары. Аргкамітэт асабліва дбае пра падтрымку маладых навукоўцаў.

**Тэмы семінару**

1. Новыя ініцыятывы і новыя медыі. Якую ролю граюць новыя ініцыятывы, менавіта новыя інстытуцыі, універсітэцкія праграмы, нефармальныя асацыяцыі, часопісы, бюлетэні і інш. , у постсавецкай навуковай супольнасці? Якім чынам яны былі сфарміраваныя? Якія іх мэты і якая іх аўдыторыя? Ці заставаўся іх уплыў лакальным альбо яны справакавалі змены па-за межамі той супольнасці, дзе яны ўзніклі? Як яны зьмяняюцца з цягам часу? Якія ў іх перспектывы? Ці звязаныя новыя ініцыятывы з рэформай Акадэміі Навук (у Расіі)?

Ініцыятыва можа быць лакальнай і нерэгулярнай, напрыклад, метадалагічны семінар, арганізаваны аспірантамі, альбо сталай, як, напрыклад, Асацыяцыя даследчыкаў вуснай гісторыі. Адзіным патрабавальным крытэрыям з’яўляецца тое, каб ініцыятыва была арганізавана знізу ў якасці альтэрнатывы вертыкальна-іерархічнай інстытуцыянальнай структуры.

2. Новыя метадалогіі у гуманітастыцы і новыя выклікі. Як уплываюць на якасць і характар даследванняў у гуманітарных навуках новыя метадалогіі і напрамкі, як, напрыклад, вусная гісторыя, гендэрныя, жаноцкія і рэлігійныя даследванні, постмадэрнізм, посткаланіяльныя даследванні і іншыя альтэрнатыўныя напрамкі? Ці быў гэткі ўплыў прадуктыўным альбо не? Ці уплываюць яны на трансфармацыю акадэмічных падыходаў альбо сталі інтэлектуальнай модай? Ці падштурхнулі новыя напрамкі і метадалогіі супрацоўніцтва паміж навукоўцамі і публічнай сферай – НДА, медыі і інш.?